# Крылатая каралева.

Птушкай 2015 года ў Беларусі абвешчана вушатая сава.

Летась у цэнтры ўвагі была зязюля, якая накукавала нам шмат чаго цікавага. Але ж сёлета да птушынага трона даляцела вушатая сава — менавіта яе абвясціла галоўнай гераіняй 2015 года грамадская арганізацыя "Ахова птушак Бацькаўшчыны".

Нацыянальнан кампанія "Птушка года" ладзіцца ў Беларусі з 2000 года, нагадала супрацоўнік па развіцці АПБ Карына Салавей:

— Галоўная мэта — прыцягнуць увагу насельніцтва да хараства прыроды і птушак, якія жывуць вакол нас, неабходнасці іх захавання. Мерапрыемствы праходзяць на працягу ўсяго года і даюць магчымасць прыняць удзел у нашык акцыях людзям самага рознага ўзросту.

Сябры клуба АПБ "Рэдкая птушка" патрапяць на сапраўдную савіную экскурсію. Сярод прыродаахоўных мерапрыемстваў — пошук месцаў гнездавання вушатай савы, вывешванне штучных гнёздаў. Рыхтуюцца інфармацыйныя матэрыялы, якія датычацца гэтай птушкі. Самых маленькіх удзелькікаў кампаніі чакаюць конкурсы малюнкаў, фотаздымкаў, вырабаў з прыродных матэрыялаў і іншыя.

— Наш досвед паказвае, што вушатыя совы добра адгукаюцца на біятэхнічныя мерапрыемствы — займаюць штучныя гнёзды. Таму АПБ будзе ладзіць шмат акцый па іх будоўлі. І навучым гэтаму ўсіх жадаючых, — падзяліўся планамі спецыяліст па прыродаахоўных пытаннях АПБ Сямён Левы.

Актыўную падтрымку кампаніі заўсёды аказваюць Мінпрыроды і Міністэрства адукацыі. Сумесна з Нацбанкам і Белпоштай плануецца традыцыйны выпуск манеты і маркі з выявай птушкі года.

Раней птушкамі года выбіраліся белы бусел, белая пліска, авяльга, дамавы верабей, гарадская ластаўка, барадатая кугакаўка, кнігаўка, звычайны салавей, вялікая белая чапля, шэрая гусь, сокал-пустальга, вялікі кулён, чорны свіргуль, удод, зязюля.

**10 цікавыхфактаўправушатуюсаву**

- ✓ Апазнавальныя "вушкі"з пер'ягэтайсавы не маюцьнічогаагульнага з вушамі. Сапраўдныяяевушыўбачыцьняпроста, боянысхаваныяпадпер'ем.
- ✓ Вушатаясава — адзін з 11 відаўсоў, якіягняздуюцца ў Беларусі.
- ✓ Па звесткаххкальцавання, самая старая вушатаясавапражыла 29 гадоў і 9 месяцаў.
- ✓ Гэтаясаваможапаварочвацьгалаву на 270 градусаў!
- ✓ Як і іншыявідысоу, вушатая не будуегнязда. "Арэндадаўцамі" для яевыступаюцьгракі, шэрыяварoны і сарокі. Гняздопавіннабыць добра схавана ў густой кронедрэва.
- ✓ Вушатаясава з вялікайахвотайзасяляештучныягнёзды.
- ✓ У Беларусівушатыя совы зімуюць. На месцахзімовакянызбіраюццашматлікімі кампаніямі. Чароды па 8-12 соў — звычайнаяз'ява, але здараецца, што ў адныммесцызбіраюцца да 30 і болей птушак, якіязнаходзяццаўдзённы часпобач, нярэдка на аднымдрэве.
- ✓ Сваімівострымі "вушкамі" з пер'ярознайдаўжыні і ярка-аранжавайафарбоўкайрадужнайабалонківокавушатаясававельмінагадваезмен шануюкопію пугача.
- ✓ Ворагаў у вушатайсавыняшмат. Найбольшуюнебяспеку для яепрадстаўляе пугач, не супрацьпачаставаццажыхарамісавінага гнязда і куніца.
- ✓ У лапы давушатайсавытрапляюцьвыключнамы шападобныя грызуны, асаблівашэрыяпалёўкі. Кабсхаліцьаднуакявяру, саветрэбазрабіць па 2-3 кідкі, а прымоцным ветры цідажджыэфектыўнасцьпаляваннязніжа ецца ў 2-3 разы.
- ✓

**Источник:** Беларусь. — 2015. — №2. — С.29.